# Год книги. Наследие.Слуцкае выданне «Манархіі турэцкай»

Унікальная калекцыя ілюстраваных рукапісных кніг і друкаваных выданняў розных краін свету захоўваецца ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Найбольшую каштоўнасць уяўляюць беларускія старадрукі з гравюрамі нашых мастакоў. Так, у зборы бібліятэкі знаходзіцца слуцкае выданне П. Рыко «Манархія турэцкая» 1678 г. з першымі гравюрамі выдатнага беларускага майстра Максіма Вашчанкі.

Вашчанка Максім Ярмаліні́ч (1650-я – 1708) – беларускі гравёр па медзі, друкар, заснавальнік магілёўскай школы гравюры. Адзін з першых у беларускім кірылічным кнігадрукаванні ўжыў тэхніку разцовага медзярыту. Вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі, дзе атрымаў ступень бакалаўра філасофіі і вольных мастацтваў (1672), званне магістра навук (1673). Друкарскую дзейнасць пачаў у Слуцку.

Слуцкая Радзівілаўская друкарня з'явілася ў 1672 г. Яе кіраўніком стаў слуцкі губернатар Казімір Клакоцкі. З друкарні выходзілі кнігі па ваенных пытаннях, мастацкія творы, мемуары, календары, падручнікі і інш. Менавіта К. Клакоцкі стаў перакладчыкам твора англійскага дыпламата, гісторыка і падарожніка П. Рыко з французскай мовы на польскую. Твор складаецца з трох кніг і распавядае пра невядомую для тых часоў краіну – Турцыю. Апісваецца тып праўлення і ўнутраная палітыка дзяржавы, звычаі краіны, турэцкія законы і інш.

19 ілюстрацый да выдання – копіі гравюр знакамітых французскіх мастакоў С. Леклерка і Н. Кашэна да парыжскага выдання 1670 г. Слуцкае выданне мае гравіраваны авантытул, на якім пазначана імя аўтара гравюр – Maximus Vasczanka. М. Вашчанка стварыў свецкі цыкл графічных работ з дакументальнай дакладнасцю і з незвычайнай для свайго часу рэалістычнасцю. Асабліва вылучаецца адзенне і зброя воінаў, аб'ёмныя фігуры коней. Аднак праявіліся і ўласныя назіранні мастака за жыццём сваіх землякоў. Так, жаночыя выявы захоўваюць рысы беларускіх дзяўчат. Увогуле мастацкія творы гравёра вылучаюцца ўмелай кампаноўкай шматфігурных сцэн, багаццем святлоценявой кампазіцыі, дасягнутай за кошт разнастайнай штрыхоўкі. Апрача таго, насуперак існаваўшай сярэднявечнай традыцыі не падпісваць выяву, М. Вашчанка адным з першых мастакоў у беларускім кірылічным кнігадрукаванні пазначыў сваё імя пад гравюрамі «Манархіі турэцкай».

Захоўваецца ў фондзе і экзэмпляр перакладу твора з польскай на рускую мову, выдадзены ў Санкт-Пецярбургу ў друкарні Акадэміі навук (1741).

Такім чынам, падпісныя медзярыты М. Вашчанкі сталі значнай з'явай у беларускім кніжным мастацтве, а фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі дазваляюць шырокаму колу наведвальнікаў пазнаёміцца з гэтым выдатным дасягненнем свайго часу.

Авантытулы, на якіх пазначана імя аўтара гравюр Максіма Вашчанкі


Silichtar Aga co szable Cesarską nosi.
Ibriectar Aga co wode do umywania Cesarzowi podaie.
Sculp: Maximus Wiszczanka
B





**Шопіна М.М., вядучы метадыст сектара музейнай дзейнасці навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства**



Дата публикации: 16:23:02 19.10.2012